*А. І. Лугоўскі (Беларусь)*

# ІДЭІ НАРОДНАЙ ПЕДАГОГІКІ Ў ТВОРАХ ЯКУБА КОЛАСА І МАКСІМА ТАНКА

Стрыжнем педагагічнай сістэмы Я. Коласа сталі вызначаныя ў аўтабіяграфічнай паэме «Новая зямля» ідэі народнай педагогікі, адпраўнымі пунктамі якой з'яўляюцца агульначалавечыя каштоўнасці, сярод якіх асабліва важнае значэнне надаецца адносінам асобы да бацькоў, роднай зямлі, працы, бацькоўскай хаты, свайго роду.

Пра М. Танка можна гаварыць не толькі як пра таленавітага мастака слова, мысліцеля, але і як педагога-самародка. Дастаткова звярнуць увагу на назвы паэтычных зборнікаў пісьменніка («Глыток вады», «Перапіска з зямлёй», «Дарога, закалыханая жытам», «Прайсці праз вернасць», «Збор калосся»), каб нават на інтуітыўным узроўні адчуць, што ў змешчаных у іх творах паэт сцвярджае мудрасць народнай філасофіі, чысціню народнай маралі, вернасць Бацькаўшчыне, яе мінуламу і сучаснасці.

Значную прастору ў паэзіі М. Танка займаюць, як і ў Я. Коласа, аўтабіяграфічныя творы. Сярод іх варта вылучыць верш «Гісторыя вёскі Пількаўшчына», у якім паэт з гумарам, але не без годнасці, малюе прыдуманае ім самім генеалагічнае дрэва свайго роду, карані якога нібыта ідуць з антычных часоў. Звесткі з уласнай біяграфіі пісьменнік выкарыстоўвае і ў шматлікіх іншых творах: «Пра сябе», «Сямейны фотаздымак», «Стол», «Смаленне кабана», «Ля дамашняга калодзежа», «Да аўтабіяграфіі», «Мой родны кут»... Усе яны адрозніваюцца адзін ад аднаго як стылёвай танальнасцю, так і ступенню верагоднасці біяграфічных фактаў, аднак аб'ядноўвае іх агульная ідэя, якую можна абазначыць Коласавымі словамі: «Мой родны кут, як ты мне мілы…», – што ўведзены пісьменнікам у апошні з названых вершаў як ключавыя.

Праз усю паэму «Новая зямля» Я. Колас праводзіць думку: з малалецтва ***чалавек як асоба фарміруецца ў сям'і***. Для дзяцей палясоўшчыка Міхала сям'я з'яўлялася і «мікра-» і «макрасветам», што было абумоўлена ўмовамі жыцця на ўлонні прыроды і ўдалечыні ад населеных пунктаў.

У кожнай сялянскай сям'і беларусаў спрадвечным крытэрыем маральнасці чалавека было стаўленне яго да *працы*. У Міхала вялікая дружная сям'я, якая жыве па сваіх законах і парадках. Тут працуюць усе, у кожнага свае абавязкі. Прыклад для малых – дарослыя. Міхал ненавідзіць службу ў лясніцтве, аднак разумее, што на той момант яна была асноўнай магчымасцю зарабіць кавалак хлеба, таму на леснікоўскай працы надзвычай адказны і акуратны. У душы Міхал – хлебароб: ён з незвычайнай любасцю глядзіць на вынікі сваёй працы, хоць і на чужой зямлі: *«Ён колас жытні і паглядзіць, / Рукою лёгенька пагладзіць, / Нібы сынка свайго малога, / І ў сэрцы дзякаваў ён Бога»* [2, с. 35].

Народная прыказка сцвярджае: «Найсмачнейшы хлеб ад сваёй працы». Хлеб як архетып, як вобраз-сімвал праходзіць праз усю творчасць М. Танка.

*«Не давайце таму хлеба,* – перасцерагае паэт, – *Хто не любіць роднай глебы, / Не арэ, не засявае / І век мазалёў не знае»* [3, с. 285]. Хлеб у М. Танка ў першую чаргу асацыіруецца з плугам, раллёю, чорнымі скібамі, цяжкай сялянскай працай. У Танкавых вершах часам *«хлеб на стол кладзецца толькі для гасцей»* [3, с. 28], яго можна ўбачыць у выглядзе сухароў для зняволенага сына, счарсцвелай скарынкі ў кайстры падарожнага або праснака ў руках хлапца-партызана. Сапраўды навучальна-дыдактычную скіраванасць мае верш «Прытча пра хлеб». У паняцце хлеб М. Танк заўсёды ўкладвае штосьці значна большае, чым проста прадукт харчавання, заробак ці сродак для існавання, гэта найперш непакой за ўсё тое, што вызначыла жыццёвую і творчую праграму паэта, што ўклаў ён у сэнс назвы паэтычнага зборніка, стаўшай крылатым выслоўем, – «Мой хлеб надзённы».

Героі паэмы «Новая зямля» Я. Коласа, як хлебаробы, надзвычай патрабавальныя да сябе і да сваёй працоўнай дзейнасці. Паказальным у гэтым плане з'яўляецца характар Антося, які «што ні замысліць, то ўсё зробіць». Ужываючы сучасную лексіку, можна сказаць, напрыклад, што пры выбары касы, адной з асноўных прылад сялянскай працы, ён уважлівы і патрабавальны да педантызму: «Другі лягчэй знаходзіць жонку – / Свой вечны лёс, сваю красу, / Чым дзядзька добрую касу» [2, с. 219].

Дзеці палясоўшчыка Міхала неаднойчы чулі размовы дарослых пра набыццё зямлі, назіралі, з якой пашанай ставіліся блізкія ім людзі да нялёгкай хлебаробскай працы, таму і самі падрасталі такімі ж працавітымі і дбайнымі. Яны ведалі, як «лёгка хлеб даецца» і заўсёды прымалі ўдзел у пасільнай працоўнай дзейнасці: пасвілі жывёлу, малацілі збожжа, прыглядалі за меншымі.

Шмат якія свае погляды на выхаванне Я. Колас раскрывае праз учынкі, паводзіны, светапогляд Антося. Дзядзька паказаны ў паэме сапраўдным педагогам, знаўцам дзіцячых душ. Яго педагагічны талент найлепш бачны ў раздзелах «Раніца ў нядзельку», «Дзядзька-кухар», «Таемныя гукі». Антось любіць сваіх пляменнікаў не на ўзроўні замілаванасці, а як актыўны ўдзельнік фарміравання ў іх самасвядомасці і духоўнасці ва ўсіх яе праявах і таму не шкадуе ні цярпення, ні часу, каб патлумачыць: *«Адкуль, з чаго дзе што бярэцца, / Вось тое, гэта як завецца / І чаму так, чаму не гэтак? / Прыхілен дзядзька быў да дзетак»* [2, с. 56].

Педагогіка дзядзькі Антося будавалася перш за ўсё на прынцыпах дэмакратызму і гуманізму ва ўзаемаадносінах з дзецьмі:*»Ён размаўляў, як са старымі, / І з імі радзіўся, спрачаўся – / Як роўны з роўнымі трымаўся!»* [2, с. 56].

Антось – прыроджаны педагог. Ён умее падтрымаць дзяцей у цяжкую хвіліну, дапамагчы добрым словам, жартам, умее своечасова выкарыстаць такі народны метад выхавання, як *заахвочванне*. Матэрыяльнае заахвочванне было сімвалічным, часта як невялічкі гасцінец у выглядзе «зайчыкавага хлеба», які сяляне прыносілі з поля, лесу, сенажаці, або той жа «пляцкі», купленай у Свержані. Такія гасцінцы не маглі развіваць у дзяцей спажывецкія адносіны да сваіх блізкіх. Перавага аддавалася маральнаму заахвочванню, як, напрыклад, прапанова пайсці ў Ліпава і зварыць там знакамітыя «клёцкі з сокам». З такой жа павагаю і любасцю адносяцца і дзеці да Антося. Для самых малых ён не проста дзядзька,

а «дзядзечка, саколік», для старэйшых – аўтарытэт: ніякіх пярэчанняў не можа выклікаць Костусева «дзядзька лепей знае».

Народная педагогіка вучыць, што маці – самы родны і самы дарагі чалавек. Гэта думка дамінуе ў паэме Я. Коласа і ў шматлікіх вершах М. Танка. Шмат цёплых і пранікнёных слоў аўтар «Новай зямлі» прысвяціў Ганне – маці вялікага сямейства, працавітай, клапатлівай і спагадлівай жанчыне.

Да мастацкага ўвасаблення вобраза маці М. Танк звяртаўся як у юнацкія гады, так і ў сталым узросце, і заўсёды ў такіх вершах аднолькава выразна высвечваюцца адносіны аўтара да жанчыны-маці, прасякнутыя любоўю, пяшчотай і спачуваннем («Над калыскай», «Пасылае маці думы», «Дома», «Маці», «Рукі маці», «Партрэт маці»). У гэтым шэрагу твораў вяршынным дасягненнем можна лічыць верш «Рукі маці», задуманы і выкананы, па словах У. А. Калесніка, як «вялікая сінекдаха» [1, с. 77]. Акцэнтуючы ўвагу чытача на адной партрэтнай дэталі (спрацаваныя жаночыя рукі), паэт з дапамогаю ўдала падабраных метафар не толькі ўзнаўляе нялёгкі жыццёвы шлях, пройдзены вясковай жанчынай-маці, але і ў пэўнай меры абагаўляе яе вобраз: *«Толькі заўсёды, / Як мы зберымося дамоў / І на стол пакладзе рукі маці, / Быццам ад сонца, ад іх пасвятлее ў хаце / І ў сэрцы»* [3, с. 241].

Пачуццё глыбокай павагі да сваіх продкаў, гонар за іх руплівасць, адказнасць за лёс родных і блізкіх – такі пафас вершаў-разважанняў М. Танка аб побытавых прадметах, вечных спадарожніках чалавека-працаўніка. Звычайныя сялянскія рэчы і прылады працы (стол, настольнік, печ, калыска, кій, боты, барана, жорны, клямка) у мастацкім асэнсаванні паэта ўздымаюцца да вобразаў-архетыпаў, якія стагоддзямі ў свядомасці пакаленняў беражліва захоўваюць уяўленне пра высокую духоўнасць беларусаў. У вершы «Парог, вычасаны з успамінаў… « ,напрыклад, сялянская памяць лірычнага героя абуджае ўспаміны пра роднае селішча – матчыну хату, дзверы, парог пры хаце, *«вокны, зашклёныя вачамі блізкіх»* [3, с. 75]. Лірычны герой не можа ігнараваць гэту памяць, выкрасліць з уласнага летапісу жыццёвы вопыт продкаў, забыць тых родных і блізкіх, каго няма побач, і не азірнуцца назад, калі б нават давялося застыць *«слупом солі»*, як гэта сталася з персанажам легенды пра боскае пакаранне жыхароў Садома і Гаморы. Архітэктоніка верша (вывад-ідэя вылучаны ў асобны тэрцэт), выкарыстанне паўтораў, метафарычнасць мовы, іншыя вобразна-выяўленчыя сродкі працуюць на сцвярджэнне галоўнага: чалавек не можа заставацца ім, не адчуваючы сябе адказным да самаахвярнасці за ўсё, што звязана з родным краем і роднай хатай.

Педагагічная сістэма Я. Коласа і М. Танка будуецца таксама на прынцыпе *еднасці чалавека з прыродай*. Яшчэ ў «Другім чытанні для дзяцей беларусаў» Я. Колас імкнуўся растлумачыць юным чытачам некаторыя тайны прыроды, навакольнага асяроддзя. У невялікіх апавяданнях ён расказвае пра з’явы, блізкія і знаёмыя дзецям і адначасова не зусім зразумелыя ім. Дыдактычная задача большасці твораў, уключаных у «Другое чытанне...», – уплываць на маральны воблік дзіцяці, фарміраваць у яго эстэтычнае пачуццё.

Тэму дзіцячай дапытлівасці, імкнення пазнаць нязведанае ў прыродзе Я. Колас працягвае ў паэме «Новая зямля» (раздзел «Таемныя гукі»). Дзеці Міхала, упершыню пачуўшы нязвыклыя гукі, якія пасля зімовай адлігі даносіліся з рэчкі, загарэліся жаданнем разабрацца ў іх таямнічым паходжанні, нягледзячы на апанаваўшы страх. У вырашэнні гэтай праблемы Антось прымяняе даволі эфектыўныя метадычныя прыёмы: спачатку крытыкуе хлопчыкаў за няведанне відавочнага і тым самым яшчэ больш распаляе іх цікавасць, а затым, як сапраўдны настаўнік, даступна, са строгай паслядоўнасцю тлумачыць прычыны прыроднай з'явы, якая адбываецца на рацэ. Стыхійны «ўрок» працягваецца і ператвараецца ў дыскусію, у час якой кемлівым ад прыроды дзецям хочацца даведацца ўжо і пра таямніцы касмічнай прасторы, узнікае жаданне «намацаць галінамі сонца».

Я. Колас не навязвае свае педагагічныя ідэі, ён паказвае, як яны могуць рэалізоўвацца на практыцы, у паўсядзённым жыцці.

Спрадвеку перад бацькамі і грамадствам стаяла задача – навучыць дзяцей любіць і шанаваць навакольнае асяроддзе.

Узгадаваны ў найпрыгажэйшых мясцінах Нарачанскага краю, М. Танк быў улюбёны ў тутэйшую беларускую прыроду і імкнуўся засведчыць свае пачуцці ў вершаваных радках, каб убачанае і перажытае ім засталося наступным пакаленням. Незвычайная паэтава назіральнасць і ўражлівасць давалі яму магчымасць папрысутнічаць «На камарыным вяселлі», падгледзець і падслухаць «Канцэрт у сене», сустрэць «Першы дзень снегападу» і шчыра здзівіцца: *«Якая ў нас сёлета восень / Багатая на журавіны!»* [3, с. 88]. Аднак у пейзажнай лірыцы М. Танка – не толькі захапленне прыродаю, але і трывога за яе сённяшні стан і будучыню, што стала надзвычай актуальным у наш час тэхнагенных катастроф і бяздумнага прыняцця рашэнняў. Так, лірычны герой алегарычнага верша «На пахаванне ракі» назірае сумную карціну: з нябожчыцай-ракою развітваюцца ўсе прыбярэжныя жыхары – буслы, жураўлі, чаплі, кнігаўкі, – ад слоў і плачу якіх *«Нат здрыганулася / Стальное сэрца экскаватара, / Які капаў канаву для ракі».* А чалавек аказаўся абыякавым і бяздушным: *«Нат нехта прэмію / За гэта пахаванне / Атрымаў»* [3, с. 234]. Гледзячы на скалечаную зямлю (верш «Экалогія), паэт разумее, што ад вінаватых апраўдання не дачакаешся, і ўсё ж пытаецца: *«Няўжо не бачыце, / Як яе здраталі, / Вытапталі, / Пакалечылі?»*. Адказу няма, застаецца толькі горыч: *«А яшчэ збіраемся / Такія ж сляды / Пакінуць / І на іншых планетах»* [3, с. 16]. Разам з тым гэты верш нельга ўспрымаць толькі як расчараванне паэта або абвінавачванне: у ім і просьба да нашчадкаў – навучыцца *«хадзіць па зямлі»*.

Агульначалавечыя каштоўнасці, якія знайшлі адлюстраванне ў творчасці М. Танка, накіраваны на фарміраванне высокамаральнай, духоўна багатай асобы, якая павінна ўсведамляць адметнасць культуры і традыцый свайго народа, зразумець сваю адказнасць перад мінулым і будучыняй. У сваю чаргу, паэма Я. Коласа «Новая зямля» – своеасаблівы мосцік, па якім пастаянна перадаецца новым пакаленням зафіксаваная ў «энцыклапедыі сялянскага жыцця» педагагічная мудрасць беларускага народа.

## Літаратура

1. *Калеснік, У. А.* Максім Танк : нарыс жыцця і творчасці / А. У. Калеснік. – Мінск : Маст. літ., 1981. – 189 с.
2. *Колас, Я.* Збор твораў : у 20 т. / Я. Колас. – Мінск : Беларус. навука, 2009. – Т. 8. – 374 с.
3. *Танк, М. Збор твораў : у 13 т. / М. Танк. – Мінск : Беларус. навука, 2006–2012.*

*Г. А. Лукашэвіч (Беларусь)*

# ФІЛАСОФСКАЯ КАНЦЭПЦЫЯ Ў ТВОРЧАСЦІ МАКСІМА ТАНКА

Максім Танк – яскравы прадстаўнік разнастайных жанраў у літаратурнай плыні XX стагоддзя. Стыль яго паэзіі разнапланавы, рухомы. Пісьменнік спрабуе сябе ў новых фарматах і жанрах, дапаўняючы творы новымі рысамі. На пачатку дарогі ён прытрымліваўся рысаў рэалістычнага пісьма, быў прыхільнікам грамадзянскай паэзіі. Адсюль яго імкненне паказаць падзеі, факты такімі, якімі яны былі ў сапраўднасці. Зрок яго спыняўся на апісанні кожнай драбніцы побыту, аднаўленні ўсіх прыкметаў штодзённага жыцця, прыроды. Невыпадкова ж ён сам пісаў, што паэзія яго падобная на камень, вырваны з маставой падчас вулічных дэманстрацый. Нататкі аб сваёй творчасці Максім Танк беражліва захоўвае ў «Лістках календара» – дзённікавых запісах. Як адзначаў сам Максім Танк, ««Лісткі календара» – гэта фрагменты маіх дзённікаў, якія пісаў я да 1939 года, да часу ўз’яднання Беларусі». Менавіта тут мы, чытачы, нашчадкі літаратурнай спадчыны пісьменніка, можам знайсці адказы на пытанні аб творчасці аўтара. Можам адчуць тое, што натхняла класіка на стварэнне яго буйной літаратурнай спадчыны. Эмацыянальны падтэкст, нявыдуманасць фактаў, вернасць праўдзе абставінаў, пераплеценых з элементамі фантазіі з’яўляецца для творчасці Максіма Танка традыцыйнай: *«Лісткі майго календара ўвесь час перагортвае і шматае навальнічны вецер. Некаторыя з іх я сам вырываю і нішчу. Цяжка па такім календары жыць, яшчэ цяжэй будзе некалі аднавіць мінулае, а па ініцыялах і клічках – уваскрасіць сапраўдныя імёны многіх маіх сяброў»* [1, с. 3].

Філасофская канцэпцыя, рэалістычны светапогляд, асэнсаванне працэсаў, што адбываюцца ў рэчаіснасці – штуршкі натхнення Максіма Танка. Гэта і ёсць адчуванне тых змен, таго ўнутранага сталення, якія адбываліся з самім пісьменнікам. Праблема «простага людскога шчасця» заўсёды хвалявала людзей розных нацый, розных эпох і ўзростаў, не абмінула гэтая тэма і Максіма Танка. Яскравым прыкладам сведчыць верш М. Танка «Шчасце» *«Простае шчасце людское, / Так, як і наша з табою, Пэўна, складаецца з солі, / З хлеба, сабранага ў полі, / З поту, з дарожнага пылу, / З роднага небасхілу, / З дружбы, мацнейшай*